ДУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма”
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# Ахоўная прыродная тэрыторыя - балота “Званец”

*рэкамендацыйны бібліяграфічны паказальнік*
*з цыкла “Па старонках календара нашай памяці”*

*Вып. 3*

Кобрын, 2016

ББК 91.9: 2 (4Беі)
А 95

***Складальнік:***

*С. Д. Курачук* - галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі УК “Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка”

***Камп’ютарны дызайн вокладкі:***

*П. С. Грыневіч* – інжынер-праграміст УК “Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка”

**Ахоўная прыродная тэрыторыя – балота “Званец”** : рэкамендацыйны бібліяграфічны паказальнік з цыкла “Па старонках календара нашай памяці” / ДУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2016. – Вып. 3. - 16 с. : фота.

# Прадмова

Тэрыторыя заказніка Званец мае статут водна-балотнага ўгоддзя міжнароднага значэння (Рамсарскай тэрыторыі) і міжнародны статут ключавой арніталагічнай тэрыторыі.

Рэкамендацыйны бібліяграфічны паказальнік ***“Ахоўная прыродная тэрыторыя – балота Званец”*** прысвечаны 20-годдзю з часу стварэння заказніка рэспубліканскага значэння Званца. Гэта 3-ці выпуск з цыкла “Па старонках календара нашай памяці”.

Выданне ўключае тэкставую даведку, каляровыя фотаздымкі і спіс крыніц аб адным з буйнейшых нізінных балот не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй Еўропе. Кнігі, артыкулы з перыядычных выданняў розных гадоў выдання размешчаны ў наступнай паслядоўнасці: спачатку кнігі ў алфавіце аўтараў, назваў, потым артыкулы з газет і часопісаў у адваротным парадку (у межах года – па алфавіту).

Паказальнік можа быць выкарыстаны шырокім колам чытачоў, якія вывучаюць свой край, цікавяцца прыродай, экалагічным становішчам Кобрыншчыны.

# Ахоўная тэрыторыя – балота “Званец”

***20 гадоў з часу стварэння ЗВАНЦА, ландшафтнага заказніка рэспубліканскага значэння (1996)***

Балотны масіў Званец размешчаны ў міжрэччы Днепра-Бугскага канала і яго прытокаў - Белаазёрскага і Арэхаўскага каналаў. З паўднёвага і паўночна-заходняга боку масіў абмежаваны меліярацыйнымі сістэмамі.



Заказнік Званец быў заснаваны ў 1996 г. як біялагічны, у 2010 г. ператвораны ў ландшафтны заказнік.

Званец з'яўляецца адным з буйнейшых нізінных балот не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй Еўропе, яго плошча перавышае 150 км$^2$.

Нізінныя балоты - адзін з характэрных ландшафтаў Беларусі і ўяўляюць сабой яе своеасаблівую "візітную картку". Звычайна яны фармуюцца ў поймах рэк і ўяўляюць сабой вялікія адкрытыя забалочаныя прасторы, парослыя рознымі відамі асакі і іншай балотнай раслліннасці. Да нашага часу балоты такога тыпу ў Еўропе амаль зніклі. Нізінныя балоты аказваюць уплыў на фарміраванне клімату вялізных тэрыторый. Яны, быццам губкі, накопліваюць у сабе вільгаць, а потым пакрысе аддаюць яе навакольным землям. Забіраючы з атмасферы вуглекіслы газ, балоты таксама выконваюць ролю своеасаблівых "лёгкіх" планеты.



Званец, як і ўсе балоты такога тыпу, аказвае



істотны ўплыў на навакольныя тэрыторыі. Акрамя таго, балота дае прытулак цэламу шэрагу рэдкіх жывёл і раслін. Тут адзначаны 23 віды раслін, 18 відаў насякомых, 2 віды млекакормячых. Усяго на балоце Званец гняздуецца 110 відаў птушак, 21 з іх занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Сярод іх - глабальна знікаючыя вяртлявая чаротаўка, вялікі арлец, драч і дубальт. Так, у Беларусі гняздуецца каля паловы сусветнай папуляцыі вяртлявай чаротаўкі і большая яе частка сканцэнтравана менавіта на Званцы.

Міжнародная значнасць балота Званец вызначаецца, у першую чаргу, падтрыманнем буйнейшай у свеце папуляцыі вяртлявай чаротаўкі Acrocephalus paludicola і іншых відаў, якія знаходзяцца пад глабальнай пагрозай знікнення: вялікага арляца Aquila clanga, драча Crex crex.

Акрамя таго, на тэрыторыі балота гняздуецца каля



1% еўрапейскіх папуляцый чаплі-бугая Botaurus stellaris і вадзянога пастушка Rallus aquaticus. Тэрыторыя таксама мае рэспубліканскае значэнне для захавання папуляцый такіх рэдкіх відаў, як шэры журавель Grus grus, бакас Gallinago gallinago, вялікі кулён Numenius arquata.

У межах балота Званец выяўлена 67 відаў



вышэйшых сасудзістых раслін, якія патрабуюць розных форм аховы. Большасць з гэтых відаў знойдзена на мінеральных астравах, якія з'яўляюцца сапраўднымі аазісамі багацейшай, а часта і проста ўнікальнай флоры сярод аднастайнай расліннасці забалочанай прасторы. На тэрыторыі балота растуць 10 рэдкіх

для Беларусі і Еўропы раслінных супольнасцей, раней шырока распаўсюджаных на нізінных балотах Палесся. З раслін, якія сустракаюцца на балоце Званец, 23 віды занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

У 2010 г. рэспубліканскі біялагічны заказнік "Званец" ператвораны ў рэспубліканскі ландшафтны заказнік. Адпаведнае рашэнне ўтрымоўваецца ў пастанове Савета Міністраў № 130 ад 1 лютага 2010 г. Пераўтварэнне выклікана неабходнасцю захавання ў натуральным стане ўнікальнай прыроднай экасістэмы нізіннага балота Званец, дзікіх жывёльных і дзікарослых раслін, уключаных у Чырвоную кнігу Беларусі, а таксама іх месцаў рассялення і вырастання.




Агульная плошча рэспубліканскага ландшафтнага заказніка "Званец" складае 16,2 тыс. гектараў. Фінансаванне яго аховы і мерапрыемстваў, злучаных з пераўтварэннем заказніка, ажыццяўляецца з фондаў аховы

прыроды і іншых крыніц. Кіруюць заказнікам Драгічынскі і Кобрынскі райвыканкамы.

Зараз Званец з’яўляецца Рамсарскай тэрыторыяй і Тэрыторыяй, Важнай для Птушак.







# Спіс крыніц

**О республиканском** биологическом заказнике "Званец" : постановление Совета Министров Республики Беларусь от 1 февраля 2010 г. № 130, с изм. и доп.: текст по состоянию на 21 октября 2015 г. № 884 // Эталон. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2016.

**О внесении** изменений и дополнений в постановление Совета Министров Республики Беларусь от 29 декабря 2007 г. № 1919 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. - 2010. - № 266. - С. 39-44. - Заказник "Званец" считается особо охраняемой природной территорией.

**Об образовании** республиканского биологического заказника "Званец" : постановление Кабинета Министров Республики Беларусь от 11 апреля 1996 г. № 257 // Собрание указов Президента и постановлений Кабинета Министров Республики Беларусь. – 1996. - № 11. - ст. 294.

**Балота Званец** // Скарбы прыроды Беларусі : тэрыторыі, якія маюць міжнароднае значэнне для захавання біялагічнай разнастайнасці / пад агульн. рэд. А. В. Казуліна. – Мінск : Беларусь, 2002. – С. 42-47 : фота.

**Заповедные** территории Беларуси / сост. П. И. Лобанок. – Минск : БелЭн., 2008. - 415 с.

**Званец**: тэрыторыі, важныя для птушак : [буклет]. – Мінск : СООО "Топпринт", 2009.

**Званец**: биологический заказник // Заповедные территории Беларуси. – Минск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2008. - С. 166-171.

**Калинин, М. Ю.** Республиканский биологический заказник "Званец"/ М. Ю. Калинин // Природные ресурсы и охрана окружающей среды Кобринского района / М. Ю. Калинин. – Минск : ООО "Белсэнс", 2009. – С. 102-103.

**Лабанок, П. І.** Званец / П. І. Лабанок // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск : БелЭн, 1999. – Т. 7. – С. 33.

**Лобанок, П. И.** Званец / П. И. Лобанок // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. - Минск, 2006. – Т. 3. - С. 638.

**Особо** охраняемые природные территории Беларуси : исследования / Управление делами Президента Республики Беларусь, Государственное природоохранное учреждение "Березинский биосферный заповедник". – Минск : Белорусский Дом печати, 2006. - Вып. 2, 2007. - 175, [1] с.; Вып. 10, 2015. - 198, [1] с.

**Рамсарские** водно-болотные угодья Брестской области / Комитет природных ресурсов и окружающей среды Брестской области. - Брест: Альтернатива, 2006 - 16 с.

**Республиканский** биологический заказник "Званец" // Я отдыхаю в Беларуси.- Минск, 2008.- С. 92-93.

**Эколого-экономический** механизм сохранения биоразнообразия особо охраняемых природных территорий: материалы III Международной научно-практической конференции (Беловежская пуща, 4-6 сентября 2008 г.) / [редкол.: А. В. Неверов и др.]. – Брест : «Альтернатива», 2008. - 198 с.

**Экологические** маршруты Брестчины : буклет / текст. Т. А. Хвагиной. – Брест : Брест. тип., 2006.

**Колосова, В.** Не исчезайте, обитатели болот! / Вероника Колосова // Родная прырода. - 2015. - № 3. - С. 7-9. - Как сохранить редкие и находящиеся под угрозой исчезновения дикие животные и дикорастущие растения в республиканских заказниках "Званец" и "Споровский".

**Болота** получат поддержку за счет средств международный организаций // Брестский курьер. - 2014. — 6 февраля. — С. 3.

**Званец** зовёт // Родная прырода. - 2014. – № 5. - С. 34.

**Дмитриева, М.** "Званец" и "Споровское" в проекте "Клима ИСТ" / Мария Дмитриева // Заря. - 2014. - 4 февраля. - С. 1.

**Елизарова, Ж.** Сохраним Званец: для себя, для людей / Жанна Елизарова // Кобрин-информ. – 2011. – 2 июня. – С. 26. – Об особенностях болота Званец и необходимости его защиты.

**Литвинович, Е.** Ты веди меня, тропа! / Е. Литвинович // Заря. - 2010. - 25 июня. - С. 12. - В республиканском биологическом заказнике "Званец" готовятся к открытию новой достопримечательности - экологической тропы.

**Отраднова, М.** О вертлявой камышовке, экстремальном туризме и "зеленых маршрутах" / М. Отрадная // Заря. - 2010. - 2 октября. - С. 8. - Исчезнувший вид вертлявой камышовки сохранился только на болотном массиве Званец.

**Турпоход** по болоту // Заря. - 2010. - 6 февраля. - С. 2. - Туристический инфоцентр в заказнике "Званец".

**Чебоксарова, М**. Живи, "Званец"! / М. Чебоксарова // Кобрынскі веснік. - 2010. - 20 лістапада. - С. 12.

**Драгоценные** болота // Экалогія. - 2009. - №2. - С. 22-23. – Болото-заказник "Званец" имеет статус рамсарской территории.

**Патоня, В**. У цэнтры ўвагі - балота "Званец" / В. Патоня // Кобрынскі веснік. - 2009. - 24 чэрвеня. - С. 1,2.

**Куклов, В.** "Размытые" границы / В. Куклов // Народная газета. - 2008. - 25 ліпеня. - С. 7-8.

**Трибулева, Е.** В краю прекрасных болот / Елена Трибулева // Вечерний Брест. - 2007. - 12 декабря. - С. 4.

**Зуенок, С.** Вяртлявая чаратоўка / С. Зуёнак // Пачатковая школа. – 2006. – № 1. - С. 59-60. – Упамін. балота Званец.

**Хлебус, Н.** Настойлівы Марцін / Н. Хлебус // Роднае слова. – 2005. - № 12. – С. 23. – Вывучэнне гнездавання на балоце Званец.

**Зуёнак, С.** Каму, як не нам самім, берагчы сваё дабро? / С. Зуёнак // Родная прырода. - 2004. - № 1. - С. 6-7.

**Муха, Ф.** Без человека птицам не выжить / Фёдор Муха // Рэспубліка. – 2003. – 9 снежня. – С. 3. – Биологический заказник республиканского значения на границе Дрогичинского и Кобринского районов.

**Гидрологический** заказник Званец [Электронный ресурс] // Красная книга. - Режим доступа : http: // www. krasnayakniga.ru/zvanets-zakaznik. - Дата доступа : 24.03.2016.

**Званец** [Электронный ресурс] // Википедия : свободная энциклопедия. – Режим доступа : https://ru.wikipedia.org/wiki/Званец_(болота). – Дата доступа : 24.03.2016.

**Природные** объекты ГПУ Республиканский ландшафтный заказник «Званец» [Электронный ресурс] // Брестчина туристическая. - Режим доступа : http://tour.brest. by/turobj/ naturalob/ 359. html. – Дата доступа : 3.03. 2016.

# Ахоўная
# прыродная тэрыторыя -
# балота “Званец”

рэкамендацыйны бібліяграфічны паказальнік
з цыкла *“Па старонках календара нашай памяці”*

*Вып. 3*

**Складальнік:**

галоўны бібліёграф

Курачук С. Д.

225306 вул. Жукава, 12, г. Кобрын
Цэнтральная раённая бібліятэка
E-mail kobrinlib@gmail.com